# Функцыя «SMS-апавяшчэнне аб парушэннях»

## Апісанне функцыі

Для падключэння функцыі «SMS-апавяшчэнне аб парушэннях» неабходна мець дзеючы дагавор карыстання платнай дарогай у сістэме BelToll.

**Для дагавораў у рэжыме перадаплаты** можна падключыць да 3-х асноўных нумароў мабільнага тэлефона, на якія будуць дасылацца SMS-паведамленні аб парушэннях у дачыненні да транспартнага сродку, зарэгістраванага па дагаворы.




**Для дагавораў у рэжыме аплаты па факце, а таксама ў рэжыме вызвалення** ад платы за праезд можна падключыць да 3-х асноўных нумароў мабільнага тэлефона, на якія будуць дасылацца SMS-паведамленні ў дачыненні да ўсіх транспартных сродкаў, зарэгістраваных у сістэме BelToll па адпаведным дагаворы, + 1 дадатковы нумар мабільнага тэлефона* для кожнага транспартнага сродку, на які будуць дасылацца SMS-паведамленні ў адносінах да адпаведнага транспартнага сродку.




* Функцыю «SMS-апавяшчэнне аб парушэннях» для дадатковага нумара можна падключыць толькі пасля падключэння як мінімум аднаго асноўнага нумара мабільнага тэлефона.

**Увага!** Падпіска на SMS-апавяшчэнне аб парушэннях будзе даступная пры ўмове выкарыстання паслуг аператара мабільнай сувязі са Спіса краін, выканання ўмоў аказання паслуг электрасувязі, вызначаных Вашым аператарам, а таксама ў адсутнасць непрадбачаных тэхнічных непаладак.

## Кошт

Функцыя «SMS-апавяшчэнне аб парушэннях» прадастаўляецца карыстальнікам сістэмы BelToll бясплатна.



# Падключэнне функцыі

Падключыць функцыю «SMS-апавяшчэнне аб парушэннях» можна адным з наступных спосабаў:

- самастойна ў Асабістым кабінеце карыстальніка на сайце www.beltoll.by;
- у любым пункце абслугоўвання BelToll.

**Важна ведаць!** Для дагавораў у рэжыме аплаты па факце, а таксама ў рэжыме вызвалення ад платы за праезд функцыю «SMS-апавяшчэнне аб парушэннях» для дадатковага нумара мабільнага тэлефона можна падключыць толькі ў Асабістым кабінеце карыстальніка на сайце www.beltoll.by.



**Як падключыць функцыю «SMS-апавяшчэнне аб парушэннях» у Асабістым кабінеце:**

1. у Асабістым кабінеце адкрыць меню з функцыяй «SMS-апавяшчэнне»;
2. увесці асноўны нумар (нумары) мабільнага тэлефона;
3. прачытаць і прыняць Умовы карыстання функцыяй «SMS-апавяшчэнне аб парушэннях», націснуць кнопку «Захаваць»;
4. далей неабходна націснуць кнопку «Пацвердзіць нумар» і дачакацца атрымання кода пацверджання на ўказаны тэлефонны нумар;
5. не пазней за 1 гадзіну з моманту атрымання кода пацверджання ўвесці яго ў адпаведным полі Асабістага кабінета.



**Як падключыць функцыю «SMS-апавяшчэнне аб парушэннях» у пункце абслугоўвання BelToll:**

1. звярнуцца ў пункт абслугоўвання, паведаміць асноўны нумар (нумары) мабільнага тэлефона і падаць неабходныя дакументы:
   - дакумент, які сведчыць асобу;
   - даверанасць або іншы дакумент, прадугледжаны заканадаўствам, які пацвярджае паўнамоцтвы прадстаўніка.
2. азнаёміцца з Умовамі карыстання функцыяй «SMS-апавяшчэнне аб парушэннях», якія захоўваюцца ў пункце абслугоўвання;
3. пасля ўнясення даных у сістэму на названы нумар тэлефона прыйдзе код пацверджання, які неабходна паведаміць супрацоўніку пункта абслугоўвання, падпісаць заяву на падключэнне функцыі «SMS-апавяшчэнне аб парушэннях».

Пасля паспяховага падключэння функцыі «SMS-апавяшчэнне аб парушэннях» на асноўнай нумар (нумары) мабільнага тэлефона прыйдзе SMS-паведамленне з інфармацыяй аб паспяховым падключэнні функцыі.

**Важна ведаць!** Для дагавораў у рэжыме аплаты па факце, а таксама ў рэжыме вызвалення ад платы за праезд у пункце абслугоўвання BelToll функцыю «SMS-апавяшчэнне аб парушэннях» можна падключыць толькі для асноўнага нумара (нумароў) мабільнага тэлефона. Дадатковыя нумары падключаюцца толькі ў Асабістым кабінеце.

## Тыпы SMS-паведамленняў

Карыстальнік сістэмы BelToll можа атрымліваць наступныя тыпы SMS-паведамленняў:

| Тып паведамлення | Прыклад |
|---|---|
| Код пацверджання | 1234 |
| Аб паспяховым падключэнні функцыі SMS-апавяшчэння на асноўны нумар мабільнага тэлефона | Подключена услуга информирования о нарушениях: договор 1234567* / Violation notification service is activated: contract 1234567*<br>* Нумар дагавора |
| Аб паспяховым падключэнні функцыі SMS-апавяшчэння на дадатковы нумар мабільнага тэлефона | Подключена услуга информирования о нарушениях: ТС 1234ВС7* / Violation notification service is activated: LPN 1234BC7*<br>* Рэгістрацыйны знак транспартнага сродку |
| Аб паспяховым адключэнні функцыі SMS-апавяшчэння на асноўны нумар мабільнага тэлефона | Отключена услуга информирования о нарушениях: договор 123456* / Violation notification service is deactivated: contract 123456*<br>* Нумар дагавора |
| Аб паспяховым адключэнні функцыі SMS-апавяшчэння на дадатковы нумар мабільнага тэлефона | Отключена услуга информирования о нарушениях: ТС 1234ВС7* / Violation notification service is deactivated: LPN 1234BC7*<br>* Рэгістрацыйны знак транспартнага сродку |
| Аб здарэнні, зафіксаваным сістэмай кантролю аплаты або ўпаўнаважанай службовай асобай Транспартнай інспекцыі | Нарушение NP[1]: тип 1[2] / violation NP: type 1 14:27:33 30.08.2018[3] TC/LPN 123456BC7<br>Нарушение FP[1]: тип 12[2] / violation FP: type 12 14:27:33 30.08.2018[3] TC/LPN 123456BC7<br>[1] NP(non-payment) – неаплата, FP(false-payment) – няпоўная аплата<br>[2] Тып здарэння<br>[3] Час і дата фіксацыі здарэння |

# Як адключыць функцыю «SMS-апавяшчэнне аб парушэннях»

Карыстальнік платнай дарогі можа ў любы час адключыць функцыю «SMS-апавяшчэнне аб парушэннях» на асноўным нумары (нумарах) мабільнага тэлефона адным з наступных спосабаў:

- самастойна ў Асабістым кабінеце карыстальніка на сайце www.beltoll.by;
- звярнуцца ў любы пункт абслугоўвання BelToll.



**Як адключыць функцыю «SMS-апавяшчэнне аб парушэннях» у Асабістым кабінеце:**

1. у Асабістым кабінеце адкрыць меню з функцыяй «SMS-апавяшчэнне»;
2. зняць птушку побач з полем «Асноўны нумар (нумары) мабільнага тэлефона»;
3. націснуць кнопку «Захаваць»;
4. пасля гэтага карыстальніку прыйдзе SMS-паведамленне пра адключэнне функцыі для гэтага тэлефоннага нумара.



**Як адключыць функцыю «SMS-апавяшчэнне аб парушэннях» у пункце абслугоўвання:**

1. звярнуцца ў пункт абслугоўвання, паведаміць інфармацыю аб мабільных нумарах, якія трэба адключыць, і падаць неабходныя дакументы:
   - дакумент, які сведчыць асобу;
   - даверанасць або іншы дакумент, прадугледжаны заканадаўствам, які пацвярджае паўнамоцтвы прадстаўніка.
2. падпісаць заяву на адключэнне функцыі;
3. пасля падачы супрацоўніку пункта абслугоўвання неабходных дакументаў і заявы на нумар мабільнага тэлефона, які трэба адключыць, прыйдзе SMS-паведамленне аб паспяховым адключэнні функцыі «SMS-апавяшчэнне аб парушэннях».

**Важна ведаць!** У пункце абслугоўвання можна адключыць функцыю «SMS-апавяшчэнне аб парушэннях» для асноўнага нумара (нумароў) мабільнага тэлефона. Адключыць гэтую функцыю для дадатковага нумара (нумароў) мабільнага тэлефона можна толькі самастойна ў Асабістым кабінеце.
Адключэнне функцыі «SMS-апавяшчэнне аб парушэннях» для ўсіх 3-х асноўных нумароў мабільнага тэлефона цягне за сабой аўтаматычнае адключэнне гэтай функцыі для ўсіх дадатковых нумароў па дагаворы.